*Аляксандр Васільчук*

## ЛЕКАВЫЯ ЯКАСЦІ «КРЫНІЧНАЙ ВАДЫ» ПАВОДЛЕ ВЕРАВАННЯЎ СЛАВЯН

Гэтая невялікая нататка прысвечаная аднаму з чыннікаў ландшафтнага кода міфапаэтычнай мадэлі свету славян. Актуальнасць вывучэння гэтага кода абумоўленая, сярод іншага, тым, што ён канцэптуе ў сабе найважнейшыя рысы традыцыйнага бачання свету старажытнымі славянамі. Сярод міфічных мясцін высокім семіятычным статусам вызначаюцца крыніцы. Лекавыя якасці крынічнай вады людзі заўважылі яшчэ
ў глыбокай старажытнасці. У народзе заўжды лічылася, што вада дапамагае перадусім ад хвароб вачэй, страўніка і болю галавы. Пасля прыняцця хрысціянства царква ўзяла пад сваю апеку большасць крыніц, якія ўшаноўвалі нашы продкі. Кожная такая крынічка і цяпер мае сваё «свята», на якое заўсёды сцякаюцца паломнікі. У гэты дзень вада з такіх крыніц лічыцца асабліва дзейснай.

Перш за ўсё трэба адзначыць, што крыніцы – прыродныя падземныя воды, якія выходзяць на паверхню зямлі; месца выйсця на паверхню падземных «ваданосных жыл», якія нясуць, па народных уяўленнях, цудадзейную і гаючую ваду. У шэрагу іншых вадаёмаў (балота, мора, рака) крыніца надзяляецца прыкметамі адмысловай чысціні, празрыстасці, сувяззю з падземнымі і нябеснымі водамі.

Матыў пра ўзаемасувязь падземных, зямных і нябесных вод сустракаецца і ў паданнях пра паходжанне крыніц і вадаёмаў. Па славянскіх уяўленнях, адразу ж пасля стварэння зямлі, каб напоўніць яе марамі, рэкамі, ключамі, Бог загадаў ісці дажджам, а птушкам загадаў разносіць дажджавую ваду ў розныя крыніцы па ўсім свеце. Узнікненне падземных крыніц тлумачылася ў рускіх апакрыфічных паданнях тым, што, рухаючыся ў падзямелле, міфічны змей Індрык пракладае шлях рачулкам і пратокам: «Куды звер пройдзе – туды ключ кіпіць». Раптоўнае з'яўленне «святых» крыніц лічылася цудам, створаным чароўнымі сіламі ці хрысціянскімі святымі: напрыклад, у ніжагародскіх паданнях апавядаецца, як Серафім Сароўскі з'явіўся на мяжы, якую праводзілі каморнікі, стукнуў па зямлі сваім кіем, – і адразу з зямлі з’явілася крыніца. Паводле іншай рускай легенды, цудоўная крыніца паўстала ад удару капытом Іллі-прарока [1, с. 427].

Традыцыю ўшанавання крыніц не заўжды ўспрымалі прыхільна. Так, у перыяд станаўлення хрысціянства яна часова прыпынілася. Тое самае здарылася, калі бальшавікі ўзяліся змагацца з рэлігіяй.

У Беларусі шмат якія святыя крыніцы называюцца Пятніцкімі. Паводле старадаўніх вераванняў, апякункай дзяўчат, жанчын і шлюбаў лічылася Параскева-Пятніца, якая заступіла сабою старажытную багіню ўрадлівасці Мокаш. А гэтая багіня, сваім парадкам, заўсёды апекавалася воднай стыхіяй, асабліва крыніцамі і студнямі, куды, як вядома, паломніцтвы адбываюцца найчасцей па пятніцах. Яскравы прыклад – Палыкавіцкая крыніца каля Магілёва, якая нібыта дапамагае ад хвароб вачэй і скуры. Сюды паломнікі збіраліся ў асноўным у дзесятую-дванаццатую пятніцы па Вялікадні, а найбольш папулярнай была адзінаццатая пятніца. Тады людзі казалі так: «хадзіць да вомуту». Яшчэ ў канцы XIX – пачатку XX стст. у абсягах ста кіламетраў ад святой крыніцы кожная жанчына і дзяўчына мусіла схадзіць туды – ісці належала пехатою. Мужчыны да крыніц амаль не хадзілі, а толькі прыязджалі забіраць сваіх родных па святкаванні Палыкавіцкай Пятніцы [2, с. 66].

Каля шмат якіх святых крыніц даўней, як і цяпер, ставілі драўляныя крыжы. На крыжах размяшчалі абразы і абразкі, вешалі ў якасці аброку саматканыя фартушкі і ручнікі. У народзе па сёння моцна трымаецца павер’е, што на крыжы каля крыніцы трэба вешаць тую частку адзення, якая судакранаецца з хворым месцам на чалавечым целе. А заадно абавязкова трэба пакласці і грошы. Лічыцца, што хвароба пойдзе разам з вадою ў свет памерлых, адкуль, згодна з тымі самымі павер’ямі, яна і прыйшла [2, с. 67].

Каля крыніц, быццам верныя вартавыя, вельмі часта ляжаць валуны. Бывае, што і сама крыніца выцякае з-пад каменя. Тады крыніца ды валун утвараюць супольную святыню, і людзі ўшаноўваюць ободва аб’екты, а часта яшчэ – і суседнюю гару [2, с. 71].

У Беларусі яшчэ і цяпер можна пачуць паданні, як каля крыніцы на дрэве, на камені ці на самой вадзе з’явіўся нейкім дзіўным чынам цудадзейны абраз. Адно з такіх паданняў расказвае, што на месцы Жыровіцкага манастыра ў 15 ст. быў густы лес з невялічкім узгоркам, з-пад якога выцякала крынічка, а побач расла груша і ляжаў вялізны камень з адбіткам у выглядзе чалавечай далоні. Аднойчы на дрэве пастушкі знайшлі абраз Божай Маці, які потым сталі ўшаноўваць вернікі ўсіх канфесій. З тае пары да крынічкі пацяклі паломнікі, яны чэрпалі цудадзейную ваду, неслі яе дамоў нават за сотні кіламетраў. Ад каменя, што потым паслужыў падмуркам для алтара, адбівалі кавалачкі, таўклі іх на парашок ды ўжывалі пры хваробах, насілі на грудзях як амулеты. А ўрэшце над каменем і крыніцай паставілі храм [2, с. 74].

Пры хаджэнні да гаючых крыніц выконваліся вызначаныя правілы паводзін: лічылася, што ісці трэба ранняй раніцай да ўзыходу сонца (радзей – апоўначы), пакуль птушка не праляцела над вадой. Людзі спяшаліся да вады, імкнучыся апярэдзіць адзін аднаго, бо «непачатая» вада шанавалася асабліва цудадзейнай. Звычай патрабаваў ісці да крыніцы і пры вяртанні ад яго моўчкі, не азіраючыся, не вітаючыся з сустрэчнымі. У шэрагу выпадкаў запэўнівалі, што для большай выніковасці трэба было ісці да крыніцы ў аголеным выглядзе ці басанож. Набіраць ваду ў рачулцы патрэбна было па яе плыні, не адліваючы залішняга зачэрпанай вады і выконваючы шэраг засцярог: жыхары славацкіх сёлаў па плыні Верхняга Грона, перш чым памыцца ў гаючай крыніцы, тройчы адводзілі ад сябе тыльным бокам далоні ваду,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прыгаворваючы «Это не мое», а затым захоплівалі прыгаршчу вады са словамі «Это мое» і абмывалі вочы, рот і вушы. Пры набіранні вады кідалі ў крыніцу манеты ці хлеб, а на беразе і ў прыбярэжных кустах пакідалі свае крыжы, хусткі, шматкі ад адзежы, ніткі. Звярталіся да вады з паважнымі формуламі, прывітаннямі і просьбамі. Балгары, каб пазбавіцца ад хвароб, хадзілі да гаючых крыніц апранутымі ў святочную адзежу. Перавага аддавалася аддаленым крыніцам у даліне ці пячорах. Людзі спяшаліся дайсці да месца раніцай, пакуль ваду не асвятліла сонца, – менавіта тады яна лічылася асабліва гаючай [1, с. 428].

У той жа час шырокую папулярнасць ва ўсіх славян мелі вераванні пра тое, што і гаючыя, і адначасова шкоднасныя ўласцівасці вады ў крыніцах залежалі ад міфалагічных персанажаў – «гаспадароў» вадаёмаў. Па балгарскіх сведчаннях, кожная крыніца мае свайго духу-ахоўніка. Шанаваннем крыніц і асцярогай нашкодзіць духам-ахоўнікам вады тлумачыцца і шэраг агульнавядомых забарон і пэўных паводзін, выконваемых поруч крыніц. Напрыклад, паўсюдна ў славян адзначалася забарона пляваць і мачыцца ў праточную ваду. Кашубы верылі, што той, хто парушыў яго, абавязкова загіне. Славакі казалі, што пляваць у крыніцу – гэта ўсё адно, што рабіць тое ж у твар Дзеве Марыі, а палякі прыраўноўвалі гэта дзеянне да апаганення Бога. У паўсядзённым жыцці стараліся хадзіць да крыніцы да заходу сонца з асцярогі сустрэць там нячыстую сілу, духаў-ахоўнікаў крыніц ці душы памерлых сваякоў. Лічылася, што нельга набіраць ваду са «святой» крыніцы ці купацца ў ёй парадзісе, а таксама жанчыне ў перыяд месячных, інакш кожны, хто зачэрпне ваду пасля іх, – захварэе, а сама крыніца высахне. Забаранялася паганіць гаючыя крыніцы мыццём бялізны, кідаць у іх смецце [1, с. 428].

Як ужо адзначалася вышэй, крынічная вада дапамагала пазбавіцца ад розных хвароб. Так, каб пазбавіцца ад ліхаманкі патрэбна было зрабіць наступнае: «Хворы мые ўсё цела вадой з трох розных крыніц, злівае ў гаршчок, накрывае кашуляй і нясе на мяжу. Тут ён здымае ўсю ніжнюю бялізну і падсцілае яе пад гаршчок. Застаўшыся голым, хворы моліцца, а затым кажа на ўсе чатыры бакі: Хто хочыць – сюды ідзіце, Маю бяду з сабою бярыце. Потым кідае ў гаршчок якую манетку, хутчэй апранаецца і бяжыць дамоў. Калі хто возьме гаршчок і грошы – ліхаманка пяройдзе да таго» [3, с. 218].

Крынічная вада лечыць і ад каросты, воніка, сурокаў.

**Спіс літаратуры:**


1. Виноградова, Л.Н. Источник / Л.Н. Віноградова // Славянские древности : в 5-ти т. Т. 2 / под ред. Н.И. Толстого. – М. : Знание, 1999. – С. 426–429.
2. Дучыц, Л.У. Сакральная геаграфія Беларусі / Л. Дучыц, І. Клімковіч. – Мінск : Літ. і маст., 2011. – 384 с.
3. Народная медыцына : рытуальна-магічная практыка / уклад. і паказ. Т.В. Валодзінай. – Мінск : Беларуская навука, 2007. – С. 776.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ